**КАБІНЕТ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ І ЛІТАРАТУРЫ** – спецыяльна абсталяванае класнае памяшканне для правядзення заняткаў па беларускай мове і літаратуры.

Важнае значэнне для арганізацыі і правядзення ўрокаў і пазакласных мерапрыемстваў у кабінеце беларускай мовы і літаратуры мае правільна ўкамплектаваная бібліятэка кабінета. Бібліятэка кабінета звычайна складаецца з асноўных прац па мовазнаўству і літаратуры, метадычных дапаможнікаў і часопісаў "Роднае слова", "Полымя", падшыўкі газеты "Літаратура і мастацтва", літаратуры па пытаннях мастацтва, падручнікаў, хрэстаматый, зборнікаў практыкаванняў, слоўнікаў.

У кабінеце беларускай мовы і літаратуры захоўваюцца планы і канспекты лепшых урокаў па асобных тэмах, найбольш цікавыя творчыя працы вучняў, вучнёўскія філалагічныя часопісы і газеты, матэрыялы, якія адлюстроўваюць метадычную працу настаўнікаў, аб'яднаных у школьнай кафедры.

Сучасны кабінет беларускай мовы і літаратуры павінен быць абсталяваны аўдыё- і відэаапаратурай, камп'ютэрнай тэхнікай для дэманстрацыі разнастайнага нагляднага матэрыялу (фрагметны школьных кінафільмаў, электронныя вучэбныя дапаможнікі, слайды, рэпрадукцыі з карцін і г.д.) і для выканання вучэбных заданняў.

Загадванне кабінетам беларускай мовы і літаратуры даручаецца аднаму з настаўнікаў-славеснікаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ